Б 05

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Зок 1
1844

Са сцягам Леніна перамаглі мы ў баях за Окцябрскую рэволюцыю, са сцягам Леніна дабіліся мы рашаючых поспехаў у барацьбе за перамогу соцыялістычнага будаўніцтва, з гэтым-жа сцягам пераможам у пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце.

Няхай жыве Ленінізм!

І. СТАЛІН.

№ 1 СТУДЗЕНЬ 1935 г.

Пісьмо ў рэдакцыю журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“ ад калгасніц калгаса „Окцябр“, Грэбеньскага сельсовета, Чэрвеньскага раёна

Пад кіраўніцтвам партыі і любімага Сталіна мы будуем светлае калгаснае жыццё. Пра старое паднявольнае жыццё жанчыны—нам расказваюць зараз газеты, кніжкі, журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“, які мы чытаем і калектыўна

абмяркоўваем. Мы любім свой журнал за тое, што ў ім апавяданні, вершы, артыкулы напісаны проста і зразумела. З кожным нумарам журнал паляпшае свой змест. Але ёсць у вас, таварышы, і недахопы. Мала ў вас мастацкага матэрыялу аб героях-жанчынах соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Мала пішаце вы аб свінагадоўлі. А наш калгас—свінагадоўлі аддае выключную ўвагу. Мы практычнай работай ажыццяўляем указанні партыі і ўрада па вырашэнню мясной праблемы.

Наша племянная свінаферма арганізавалася ў 1929 годзе. Не клеілася спачатку справа ў нас. На ферму ніхто не хацеў ісці працаваць. Мужчыны з нас смяяліся, што мы свінаркі і т. д. Але такія адносіны да нас хутка змяніліся.

У пачатку 1930 года мы набылі 20 свінаматак. А ў канцы года ў нас ужо было 60 свінаматак. Для іх мы пабудавалі добры свінарнік, абсталявалі яго і забяспечылі ўсімі неабходнымі кармамі.

У 1931 годзе па плану наша ферма павінна была мець 250 свінаматак, але ў сувязі з недахопам кармоў, мела—170 свінаматак. Недавыкананне плана і тыя цяжкасці, якія часта сустракаліся ў нашай рабоце, прымусілі нас аддаць усю сваю ўвагу ферме. У выніку дружнай, ударнай работы ўсіх калгаснікаў наша ферма зараз з'яўляецца лепшай не толькі па Чэрвеньскаму раёну, але адной з лепшых па БССР. Да нас прыязджалі дзесяткі экскурсій і мы ганарымся вынікамі сваёй работы.

У 1934 годзе па плану мы павінны былі атрымаць 42 апароса, а атрымалі—72 апароса. Прыплоду мы павінны былі атрымаць 276 парасят, але атрымалі 526. Брак парасят у нас складае зусім нязначны процант. У сярэднім кожны наш чатырохмесячны парасёнак важыць ад 31 да 37 *кг.*

За добрую работу нас прэміравалі. Мы атрымалі прэмію—3.000 руб. Сямён Антонавіч—загадчык фермы атрымаў персанальную прэмію—1.000 рублёў. Сваёй добрасумленнай работай мы далі калгасу—50.000 рублёў прыбытку. Кожная свінарка зарабіла за 1934 год па 400 працадзён. На працадзень калгаснікі нашага калгаса атрымліваюць па 2,5 *кг* збожжавых і па 1 руб. грашыма. Такім чынам работа кожнай свінаркі будзе добра аплачана нашым калгасам.

Зараз мы спаборнічаем з племфермай калгаса імя Тэльмана, Дзяржынскага раёна. Тэльманаўцы ад нас пакуль што адстаюць, але мы спадзяемся, што ў бліжэйшыя часы тэльманаўцы будуць ісці з намі наравні па ўсіх паказчыках сваёй работы.

Наладжваючы сваю культурна-масавую работу, мы жадаем, каб наш журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“ больш знаёміў нас з вопытам работы на другіх фермах. З гэтай мэтай па сваёй ферме і ўсяму калгасу мы зараз праводзім пад, піску на журнал на 1935 год і выклікаем паследваць нашаму прыкладу калгасніц калгаса імя Тэльмана.

Подпісы: Ахрамовіч Ніна (брыгадзір), Пачасуй Надзя, Трыпуз Надзя, Жданок Надзя, Бандарэвіч Аня, Андрэйчык Надзя Лук'янаўна, Андрэйчык Надзя Данілаўна.

МИОКО

М. ЕРШОВА
Москва

Есть страна Октября и раздолья
Девушки в ней—комсомолки,
И есть страны, где Октябрь в подполье
И девушки, как Миоко.

Лицо Миоко прозрачней черешни,
Бледно-розовой и атласной,
Но не продаст свой цветочек вешний
Учитель Комибаяси.

Часто девочка, отдавая иены,
Заработанные у станка трудом,
Слушала чтение о Ленине,
Повторяя слова за отцом.

Однажды, когда дневные краски
Уходили в густую тьму,
Полицейские Нагасаки
Увели учителя в тюрьму.

Закон Японии пропитан кровью,
Выкуп возможен за нежность лица,
Но не продастся Миоко в джоройю
А продолжит дело отца.

Ночь над Миоко полную гореть
Светляков качала в сини.
Миоко знала: охапками звезд
Она расцветит жизнь рабыни.

И знала Миоко у Японии кротость
Делает сердце похожим на лилию,
А в борьбе оно острее чем кортик
Отточенное ленинизмом.

И Миоко в подполье решила просто,—
Строгая к себе и всему—
Уничтожить старых законов коросту,
И знамя поднять Коммун.

Лучший шолк—небесная синь,
Но такого у Тойодо нет,
Фабрика Тойодо держит рабынь,
Продавших себя за хлеб.

У Тойодо было много таких
Печальных, как в небе луна,
Но работницам слово Миоко, как стих
Упало в сердце звеня.

За агитацию угрожал палач
Новой мыльной веревкой.
Но Миоко учила подруг, как плач
Переключать в забастовки.

Эта ночь для Тойодо—полна тревог,
Даже купленные ушли от станков,
Напрасно след полицейских сапог
Отпечатала четко кровь.

Он прибавил на хлеб несколько иен,
Слушая митинга рокот,
Но, укорачивая работницам день,
Позвонил об аресте Миоко.

И когда уходила она в кольце
Штыков блестяще отточенных,
Кто-то звонко о ней и ее отце
Запел средь толпы рабочих.

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 111

11 ГОД БЕЗ ЛЕНІНА

ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ

Які вялікі гістарычны шлях прайшла наша краіна за гэтыя 11 год, пад кіраўніцтвам любімага правадыра партыі і пролетарыята тав. Сталіна па шляху, які ўказаў Ільіч.

Совецкі Саюз стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай. На прасторах краіны советаў ад палёў Беларусі да далёкага Прымор'я, ад Архангельска да Каўказскіх гор выраслі гіганты соцыялістычнай прамысловасці. Сталінградскі і Харкаўскі трактарныя заводы, якія ўжо далі краіне сотні тысяч першакласных трактароў, Чэлябінскі трактарны завод, які выпускае магутныя шасцідзесяцісільныя „сталінцы", Маскоўскі і Горкаўскі аўтамабільныя заводы, Уральскі і Краматорскі заводы цяжкага машынабудаўніцтва, самыя вялікія ў свеце—вось яны яркія паказальнікі сілы і магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы, яе індустрыяльнага росквіту.

Зусім нядаўна перад новым годам Совецкі Саюз атрымаў яшчэ адну буйнейшую слаўную перамогу. Чорная металургія Саюза датэрмінова выканала праграму 1934 года і дала краіне 10 мільёнаў тон чыгуна. Поўнасцю выканан таксама план па выпуску сталі. Совецкі Саюз вышаў на першае месца ў свеце па выплаўцы чыгуна. „Мы цяпер краіна металічная" (І. В. Сталін).

Лістападаўскі пленум ЦК ВКП(б) прыняў гістарычныя рашэнні аб ліквідацыі картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах і аб палітаддзелах у сельскай гаспадарцы.

Адмена картачнай сістэмы—рэзультат перамогі справы калектывізацыі, рэзультат нашага росту. Лазар Маісеевіч Кагановіч гаварыў на сходзе актыва Маскоўскай партыйнай арганізацыі:

„Калгасы і соўгасы далі ў гэтым годзе ўжо 92 проц. загатоўленага хлеба. Дзяржава мае паўтара мільярда пудоў хлеба (у два з лішнім разы больш, чым у 1928 годзе)"...

Сусветна-гістарычныя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва дасягнуты пад ленінскім кіраўніцтвам тав. Сталіна, у бязлітаснай і непрымірымай барацьбе супроць усіх і ўсякіх ворагаў ленінізма, супроць ворагаў пролетарскай дыктатуры, супроць здраднікаў пролетарскай рэволюцыі.

Партыя сакрушыла трацкізм, які стаў перадавым атрадам міжнароднай контррэволюцыі.

Партыя разбіла былую зіноўеўскую апазіцыю, якая ў сваёй барацьбе супроць ленінізма, супроць партыі і рабочага класа ўступіла ў прамы саюз з контррэволюцыйным трацкізмам і стала на шлях подлай і гнуснай здрады, на шлях прамых ворагаў пролетарскай рэволюцыі, прыкрываючы свой сапраўдны твар ілжывымі двурушніцкімі раскаяннямі.

Партыя разбіла правых ухілістаў, якія абаранялі інтарэсы кулацтва, якія імкнуліся звярнуць партыю з ленінскага шляха на шлях аднаўлення капіталізма ў нашай краіне.

Партыя, як ніколі зараз маналітна і згуртавана вакол сталінскага ЦК, вакол тав. Сталіна.

На XVII з'ездзе ленінскай партыі тав. Сталін у сваім справаздачным дакладзе аб рабоце ЦК ВКП(б) гаварыў, што „з'езд праходзіць пад сцягам поўнай перамогі ленінізма, пад сцягам ліквідацыі рэшткаў антыленінскіх груповак.

Разбіта і рассеяна антыленінская група трацкістаў. Яе арганізатары акалачваюцца цяпер за граніцай на задворках буржуазных партый.

Разбіта і рассеяна антыленінская група правых ухілістаў. Яе арганізатары даўно ўжо адракліся ад сваіх поглядаў і цяпер усяляк стараюцца загладзіць свае грахі перад партыяй.

Разбіты і рассеяны нацыянал-ухілісцкія групоўкі. Іх арганізатары канчаткова спаяліся з інтэрвенцыянісцкай эміграцыяй, або прынеслі павінную.

Большасць прыхільнікаў гэтых антырэволюцыйных груп вымушана была прызнаць правільнасць лініі партыі і капітуляваць перад партыяй.

Калі на XV з'ездзе прыходзілася яшчэ даказваць правільнасць лініі партыі і весці барацьбу з вядомымі антыленінскімі групоўкамі, а на XVI з'ездзе—дабіваць апошніх прыхільнікаў гэтых груповак, то на гэтым з'ездзе—і даказваць няма чаго, ды, бадай—і біць няма каго. Усе бачаць, што лінія партыі перамагла.

Перамагла палітыка індустрыялізацыі краіны. Яе рэзультаты для ўсіх цяпер відавочны. Што можна супярэчыць супроць гэтага факта?

Перамагла палітыка ліквідацыі кулацтва і суцэльнай калектывізацыі. Яе рэзультаты таксама відавочны для ўсіх. Што можна супярэчыць супроць гэтага факта?



(Кузбас) Сталінскі металургічны завод 4-я домна.

Даказана на вопыце нашай краіны, што перамога соцыялізма ў адной асобна ўзятай краіне—упаўне магчыма. Што можна супярэчыць супроць гэтага факта?

Відавочна, што ўсе гэтыя поспехі і, перш за ўсё, перамога пяцігодкі, канчаткова дэмаралізавалі і разбілі ў прах усе і ўсякія антыленінскія групоўкі.

Трэба прызнаць, што партыя цяпер згуртавана ў адно, як ніколі раней".

Ленінская ідэя соцыялістычнага спаборніцтва глыбока ўвайшла ў свядомасць мільённых мас, стала магутным рухавіком соцыялістычнай працы на шчасце і гонар нашай радзімы. Жанчына ў краіне Советаў, работніца і калгасніца—поўнаправныя і актыўныя ўдзельнікі соцыялістычнай будоўлі. Владзімір Ільіч Ленін няўтомна вучыў партыю, што трэба смела вылучаць жанчыну на кіруючую дзяржаўную работу, што трэба дабіцца, каб кожная кухарка ўмела кіраваць дзяржавай, што трэба штодзённа выхоўваць і ўцягваць працоўных жанчын у соцыялістычнае будаўніцтва.

Партыя пад кіраўніцтвам тав. Сталіна няўхільна выконвае гэты завет Ільіча. Сотні і тысячы жанчын вылучаны на адказнейшыя дзяржаўныя пасты, працуюць у советах, кіруюць фабрыкамі, заводамі, калгасамі. Вось некалькі характэрных і яркіх лічбаў толькі па адной нашай рэспубліцы.

За гады першай пяцігодкі дзесяткі тысяч жанчын сталі працаваць на вытворчасці. У 1928 годзе жанчыны складалі толькі 28,5 проц. агульнай колькасці рабочых, занятых у прамысловасці БССР. А да першага студзеня 1934 года гэта лічба ўжо выросла да 46,8, амаль у два разы.

Не менш характэрны лічбы і матэрыялы справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў. Па 852 советах былі праведзены 11.363 справаздачных сходы, у якіх прымалі ўдзел 847.147 выбаршчыкаў. З іх жанчыны складалі 74,6 проц. І гэта толькі па 852 советах. Якое яркае пацвярджэнне таму, што масы працоўных жанчын усё больш і больш уцягваюцца ў непасрэдную работу па кіраўніцтву дзяржавай, што актыўнасць працоўных жанчын расце не па днях, а па гадзінах.

Сярод членаў новаабраных сельсоветаў БССР жанчыны складаюць 26,8 проц. У члены гарадскіх советаў абрана 28,2 проц. Дзве жанчыны абраны старшынямі гарадскіх советаў, шэсць—адказнымі сакратарамі і т. д. і т. д.

За мінулыя 11 год праведзена сапраўды велізарнейшая гістарычная работа па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод працоўных жанчын, па карэннаму паляпшэнню іх матэрыяльна-бытавых умоў.

Сотні і тысячы жанчын на фабрыках і заводах, у соўгасах і калгасах сталі сапраўднымі арганізатарамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, героямі соцыялістычнай працы, героямі аўладання тэхнікай, важакамі мас.

Перамогі соцыялістычнай будоўлі, перамогі соцыялістычнага наступлення выклікаюць шалёную смяротную нянавісць урэшткаў класавага ворага, недабітага кулацкага ахвосця. Вораг не склаў яшчэ зброі і супраціўляецца з усіх сваіх апошніх сіл пераможнаму наступленню соцыялізма.

Ад рукі забойцы, падасланага класавым ворагам, загінуў палкі пролетарскі рэволюцыянер, лепшы саратнік тав. Сталіна, правадыр партыі і рабочага класа Сяргей Міронавіч Кіраў.

Тав. Кірава трусліва і подла забілі з-за вугла гнусныя падонкі былой зіноўеўскай апазіцыі, стаўшыя на шлях белабандыцкага фашысцкага тэрора.

Ідэйнымі настаўнікамі гэтых фашысцкіх белабандытаў, гнусных і подлых забойцаў тав. Кірава былі Зіноўеў і Каменеў, гэтыя здраднікі, якія ўвесь час подла ашуквалі партыю, якія прыкрывалі сваю звярыную нянавісць да партыі ашуканскімі двурушніцкімі заявамі аб раскаянні. Але вораг памыліўся ў сваіх подлых планах. Уся краіна, мільёны працоўных вынеслі свой прыгавор ворагу. Жалезны меч пролетарскай дыктатуры знішчыў гнусных забойцаў. Гадзюка раздаўлена. Уся краіна, мільёны рабочых і калгаснікаў гранітнай непахіснай сцяной яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол ленінскай партыі, вакол дарагога любімага Сталіна.

Вышэй рэволюцыйную пільнасць, вастрэй бязлітасную непрымірымасць да класава-варожага атрэп'я, мацней сакрушальны удар па ворагу—адзіная думка мільёнаў.

Змятаючы прэч са сваёй дарогі рэшткі ворага, наша партыя пад кіраўніцтвам свайго любімага і мудрэйшага правадыра тав. Сталіна вядзе краіну, мільёны пролетарыяў і калгаснікаў наперад па шляху, указанаму Ільічом.

Магілеўская шоўкавая фабрыка. Сарціроўка нітак.

Т. Кляшторны

У мільёнаў б'ецца Ленінскае сэрца

Калі Саюз яшчэ гарматныя сляды
Не здаў гісторыі, як помнікі старыя;
Калі пасля грымот сусветных гарады
Цэмантавалі раны індустрыяй,
За верстаком тады баец і партызан,
Чый кожны дзень быў пульсам навальніцы,
Успамінаў пра боль уласных ран,
Якія не паспелі загаіцца.
І ўспамінаючы, што—„мы перамаглі"!
Душа байца зарэла мужнай верай...
Упарта частка шостая зямлі
Ішла за Леніным—наперад і наперад.
Зарэла нам вялікая зара.
Зямлі ранейшае змянялася аблічча,
У кожным руху—моц правадыра,
І кожны крок—паленінску разлічан.
Прышоў праз бойкі, краты і расстрэл
Пролетарыят перабудаваць планету...
І—раптам вестка: „Ленін захварэў"
Трывожным гоманам прабегла па сусвету.
З лядоўні Поўночы дыхнулі на Маскву
Вятры шялёныя і лютыя марозы...
На плошчах, вуліцах паціснуўшы руку,
Панура масквічы шапталіся ў трывозе:
— Ну, як здароўе?
— Кажуць бюлетэнь
Сягоння менш трывожны як ўчора!..
Так—што ні дзень, так—кожны дзень
Тут хвалявалася людское мора.
Мільённы вал загаманіў тады:
„Хіба-ж пульс Леніна пакінуць можа біцца?
Ці-ж можа памірaць сусвету правадыр?
Ці-ж можа геній смерці пакарыцца?
Само жыццё, гісторыя сама
За Леніна, як творцу—чалавека..."
І раптам—вестка: „Леніна няма",
Замкнула смерць навек яго павекі.
Вялікі творца, геній, правадыр,
Баец і вартавы пакінуў поле бою..."
І з мільёнаў позіркаў тады
Зірнула роспач смуткам і жальбою.
І кожны чуў, і кожны бачыў сам,
Як нешта велічэзнае ў роспач вырастала...
На вуліцах працоўнае Масквы
Глухім прыбоем гора ракатала.
А там, на плошчы, у ноч, у пустату,
Нібы ступаючы на пліты плахі коўзкай,
Наўзрыд заплакаў глуха на пасту
Міліцыянер, спыніўшы рух маскоўскі,
Жалобай чорнаю абвіта ўся зямля,
Жалоба чорная плыла нястрымным валам...
Так нават шторм марэй не хваляваў,
Як гэта смерць мільёны ўсхвалявала.
Трывогамі агорнута—ўсё...
Трывожна мчалі хвалі радыё ў далі...
Ад сцен Крэмля, заводаў і да сёл
Яшчэ несказаныя словы накіпалі:
„Наш Ленін—жыў! Ён тут паміж жывых!
Як і раней—тут сцяг яго віецца!
Яго жыццё цяпер—у нас саміх!
У мільёнах б'ецца ленінскае сэрца"...
І клас наш, нясучы большэвіка ў маўзалей,
Сказаў і будучым і нашым пакаленням:
„Хоць і хаваем Леніна, але
Жыве наш неўміручы Ленін!
— З тваіх шляхоў не звернем, правадыр,
Даль перамог не засцяць золь і хмары!"
І клас наш ў ленінскую партыю тады
Паслаў дзесяткі тысяч лепшых пролетараў.
Ускалыхнуўся лавай мужны строй.
Напружнасць дзей і спраў загаманіла:
„Хай вораг наш над ленінскай труной
Не цэдзіць слёз паскудных кракадзіла!
Ёсць партыя, ёсць ленінскі Саюз
І Ленін—жыў! Наш дух—яго аблічча!
У творчай працы б'ецца яго пульс...
Наш кожны крок па ленінску разлічан!..
Так нават шторм марэй не хваляваў,
Як гэта смерць мільёны ўсхвалявала...
Узрыдам сцюжы ўсхліпнула зямля,
Як маладосць над процьмаю абвала.
Тады Саюз яшчэ гарматныя сляды
Не здаў гісторыі як помнікі старыя...
Пасля грымот сусветных гарады
Яшчэ гаілі раны індустрыяй...

. . . . . .

Гады ішлі, з гадамі мы раслі,
Выконваючы Леніна заветы...
Адна шастая нашае зямлі —
У рыштаваннях волатаў сусвету.
Дэкляравалі мы: „дагнаць і перагнаць!.."
І вось вам нашай працы росквіт:
— За тры-чатыры, не за пяць,
Пасталі ў строй Магнітагорскі.
Няма больш месца спадчыне тупой!
Большэвікі ніколі не марудзяць...
Тут з кожным днём становяцца ў строй
Турксібы, Сталінбуды, Днепрабуды.
Вось так расце ў наш вялікі век
Краіна электросвітання...
А самае галоўнае, што чалавек
Узрос вышэй сваіх вялікіх рыштаванняў
Сама гісторыя дае правы расці,
Дае правы гісторыя на росквіт...
У побыце, культуры і жыцці
Будуюцца магутныя Магнітагорскі!
... Гады ішлі, з гадамі мы раслі,
Выконваючы Леніна заветы...
Адна шастая нашае зямлі—
У рыштаваннях волатаў сусвету.
Адна шастая нашае зямлі.
Ператварылася ў краіну індустрыі...
Машынным гоманам калгасныя палі
Паўсталі супроць дзікае стыхіі.
Мы творым з Леніным, мы з Леніным бярэм
Вышыні сонечныя эры.
Перамагаем з Леніным паўночны лёд марэй
І заваёўваем мы стратасферу.
Наш Ленін—жыў! ён тут—паміж жывых!
З гігантаў пяцігодкі—сцяг яго віецца.
Яго жыццё цяпер—у нас саміх.
У мільёнах б'ецца ленінскае сэрца.
Заваявалі мы прастор і даль, і шыр,
Любоў працоўных свету мы заваявалі.
Вядзе нас ленінская партыя і слаўны правадыр
Працоўных усёй зямлі—Вялікі Сталін!

АДНА З МНОГІХ

С. БОГУШ

Тав. Карэльская.

I.

Фабрычны гудок разліўся гучным рэхам па гораду і ваколіцам. Людзі ў рознакаляровых пальто, куртках высыпалі з фабрычнага двара. Разам з усімі вышла і Хіля Абрамаўна Карэльская—герой пяцігодкі, лепшая ўдарніца швейнай фабрыкі „Окцябр". Яна была вясёлай і ўзнятай:

— Як не радавацца, як не ганарыцца, калі мая брыгада ўпэўнена крок за крокам ідзе ад перамогі да перамогі,—весела расказвала Абрамаўна свайму спадарожніку. У яе голаве ўсплылі шчырыя словы брыгадзіра тав. Патэнта, які перад сканчэннем работы паціскаючы ёй руку сказаў:

— „Абрамаўна, дар жэнькая маяl Гэта-ж наша брыгада за перавыкананне прамфінплана, па ўсім паказальнікам вызначана на атрыманне пераходнага сцягу".

І вось зараз ідучы да хаты, яна Абрамаўна—парторг брыгады разважала—як на ўрачыстым сходзе яе брыгада атрымае сцяг і як ён потым будзе калыхацца ля машын яе брыгады, як сімвал перамог.

— Выходзіць, што я апраўдваю ганаровую назву комуністкі ленінскага прызыва,—з такімі шчырымі словамі Абрамаўна пераступіла парог прыгожай, цёплай, утульнай квагэры і пачала распранацца. Да яе падышоў муж і заглядаючы ў чорныя вугалёчкі вачэй сказаў:

— Ты, браце, у мяне зараз вялікі чалавек! Гонар не толькі для мяне, але і для фабрыкі для ўсёй краіны!

— А ў чым справа?—паціскаючы плячыма сказала не разумеючы яго Абрамаўна.

— Ды вось там у пакойчыку чакае адзін таварыш, які прышоў з табой пагутарыць—і яго рука ўпёрлася ў бакавыя дзверы.

II.

— Мне зараз 45 год з іх 32 гады я працую па найму,—так пачала сваю прамову Абрамаўна. 13 год працавала на фабрыкантаў Нагалера і Беккера, там у панскай Польшчы. Потым у Лодзі я гнула на іх спіну. 14 год яшчэ не было, а я пачала ўжо працаваць, з тым, каб зарабіць і дапамагчы бацькам, якія большую частку года сядзелі без работы. Бацька мой увесь час працаваў штукатурам. Ну і баставаў безумоўна, а хто бастуе ў Польшчы, той заўсёды беспрацоўны. І яму нідзе няма месца для таго, каб зарабіць кусок хлеба.

— Доўгі час я выбірала куды пайсці працаваць і нарэшце вырашыла—стаць белашвейкай. Але для таго, каб стаць белашвейкай, трэба вучыцца, і я пашла вучыцца к фабрыканту Нагалеру. Не паспела я пераступіць і парог яго габінета, як ён пачаў допыт:

— „Па першаму—колькі разоў баставаў бацька і калі атрымаў адказ?

— Ні разу,—адказала я. Тады ён запытаўся ці пісьменная я, і калі пачуў адмоўны адказ, толькі тады згадзіўся мяне прыняць у вучаніцы".— Але ведаеце, вучань у польскіх фабрыкантаў не мае права на заробатак. Таму я першы год, за работу нічога не атрымлівала,—казала Абрамаўна.

Галеча, жабрацтва прымусілі мяне пакінуць бацькоў і паехаць у Лодзь шукаць свайго лёсу, шукаць работы. Але там таксама прышлося абыйсці ўвесь горад, усе фабрыкі пакуль не была прынята да фабрыканта Беккера пры ўмовах:—„ні баставаць, ні скардзіцца на парадкі, быць задаволенай зарплатай". Вырваўшыся ад Нагалера я трапіла як кажуць:—з агня ды ў полымя. Працавала там ад 12 да 14 гадзін у дзень, а плата зноў такі—1 рубель. Адным словам не жыццё было, а жудасць. Але што аб гэтым казаць. К чорту ўсё старое. Абрыдла яно мне во як...

* * *

Расшпіліўшы пальто Абрамаўна пачала з радасцю апавядаць пра сваё змястоўнае, бадзёрае, радаснае жыццё тут у краіне соцыялізма.

— Пакінула я Польшчу ў 1917 годзе, тады калі да нас даляцела доўгачаканая, хвалюючая вестка аб тым, што знікла старая царская Расія, што ўл ду ўзялі ў свае рукі рабочыя і сяляне. Так скончылася маё нікчэмнае, суровае жыццё, поўнае здзекаў і эксплаатацыі там у Польшчы і пачалося новае, зусім не падобнае, прыгожае жыццё тут, дзе кожны рабочы адчувае сябе гаспадаром.

Твар Абрамаўны пачырванеў і яна з захапленнем пачала апавядаць аб вялікай радасці ў сваім жыцці—аб уступленні ў комуністычную партыю.

— Доўга ў сваім сэрцы я насіла шчырае пачуццё аб партыі. Яшчэ там—у Польшчы бачыла я, як мужна комуністы змагаюцца за лепшае жыццё. Уступіла я ў комуністычную партыю ў 1924 годзе, калі рабочыя і сяляне, калі ўся краіна Советаў, увесь свет быў апрануты у жалобу і сумаваў аб страце любімага і дарагога Ільіча. Тады быў абвешчан ленінскі прызыў. Я адна а першых адгукнулася на яго і ўступіла ў партыю, каб стаць маленькай часткай згубленага ленінскага партбілета.

— І гэта быў мой лепшы адказ на смерць любімага правадыра працоўных і сялян усяго света. Я тады была не адна. Нас было сотні тысяч. З уступленнем у партыю, я стала яшчэ больш адчуваць, што я таксама ўдзельніца вялікіх ленінскіх спраў. Я ганаруся, што актыўна дапамагаю партыі і ўраду будаваць соцыялізм, будаваць бяскласавую грамаду. Хаця мне зараз і 45 год, але сілы яшчэ шмат. І я абавязкова дажыву да таго часу, калі ва ўсім свеце будзе гарэць чырвоная звязда. Крыху перадыхнуўшы Абрамаўна працягвала:

— Шмат гадоў прабегла з таго часу. Акрэпла я, дужа акрэпла за гэты час. Раней я нічога не мела ў жыцці, а зараз. О, зараз я ўсё маю—і радасць, і сэнс. Абрамаўна высока ўзняла голас:

— Сэнс майго жыцця - гэта барацьба за генеральную лінію партыі, за соцыялізм, за бяскласавую соцыялістычную грамаду, а радасць мая—гэта радасць за дзяцей. І як за іх не радавацца. Вось узяць хоць-бы сына, ён хутка канчае інстытут, а яму ўсяго 20 год.

— Аб сваёй рабоце на швейнай фабрыцы скажу коратка. Работаю не дрэнна. Ніжэй 110-проц. выканання плана не даю. Тры разы прэміравалася. Адным словам партыя і ўрад бачаць і шануюць маю работу. Трэба спалучаць работу на вытворчасці з партыйнай і грамадскай работай. Гэта яскравая рыса кожнага комуніста і комуністкі і я яе здаецца навучылася спалучаць. Вось узяць хоць-бы тое, што я парторг брыгады, а ў мяне ў брыгадзе 75 чалавек. Апроч гэтага—я старшыня дэпутацкай групы і з работай спраўляюся не дрэнна, але гэта яшчэ не ўсё, не забываюся я і аб павышэнні палітычнага і агульна-асветнага ўзроўня, таму я акуратна наведваю Комвуз.

— Аб сваёй рабоце, як парторга брыгады, пастараюся паказаць хоць-бы прыкладам барацьбы за аўладанне тэхнікі,—і дастаўшы з невялічкай папкі чырвоны сшытак, Абрамаўна працягвае:

— Большэвікі павінны аўладаць тэхнікай,—так у 1931 годзе сказаў любімы правадыр тав. Сталін. Гэты лозунг быў спаткан з вялікім уздымам рабочымі нашай фабрыкі. У кожным цэху, у кожнай брыгадзе былі арганізаваны тэхнічныя гурткі па вывучэнню тэхнікі. Уся фабрыка ўзялася штурмаваць тэхніку. Арганізавала і я такія гурткі ў сваёй брыгадзе. Кожны рабочы маёй брыгады трымаў у сваім сэрцы Сталінскія словы:

— „Калі не аўладаем тэхнікай, нас самнуць нашы ворагі".

— З арганізацыяй гурткоў, пачалася ўпартая настойлівая вучоба. У чырвоным кутку завяла я дошку тэхнікі, адвялі нам куток тэхнікі, зрабіла альбом, брыгадная і штодзённая насценгазеты штодзённа друкавалі старонкі тэхнікі, дзе я паказвала ўзоры работы перадавікоў, ганьбіла адстаючых і навучала іх працаваць па Сталінску. Дзякуючы большэвіцкім метадам работы, зніклі перабоі ў рабоце, паменшыўся брак, амаль на 100 проц. брыгада стала зотаўскай. Зараз мы ўпэўнена крочым уперад, займаючы неаднаразова на фабрыцы першае месца. Мая брыгада занесена кандыдатам на атрыманне чырвонага сцяга.

Так жыве і працуе Хіля Абрамаўна Карэльская — комуністка ленінскага прызыва. А колькі іх яшчэ такіх ёсць у нашай краіне соцыялізма. Іх сотні і тысячы сярод шматмільённай арміі комуністаў, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна.

Менск, фабрыка „Окцябр".

ПА ШЛЯХУ, ПАКАЗАНАМУ ЛЕНІНЫМ

Тав. Ганчарык.

I.

Марозны студзеньскі вечар. Горад абсыпан срэбрам электрычных зор. Некалі гарадок гандлярскіх анекдотаў, саматужнікаў і жабракоў, Менск сёння—сталіца Совецкай Беларусі бліскоча агнямі Ленінскіх перамог.

Уся ў пералівах святла шуміць Совецкая вуліца, бурлівіць тысячамі галасоў. Цвёрдым поступам у гэтым патоку крочыць яна—комуністка ленінскага прызыву.

Першая была яна сярод многіх тысяч энтузіястаў, ударнікаў соцыялістычнай будоўлі, сярод тых, хто будаваў гэты горад.

Вось чаму так ярка квітнеюць агні новага Менску!

II.

У павуцінні беднасці, пад прыгнётам цяжкое працы, пад грубыя выкрыкі гаспадароў прайшло юнацтва тав. Ганчарык.

— Мой бацька і мой дзед былі мулярамі. Яны рабілі печы і чысцілі коміны. Я працавала ў кандзіцерскай—пякла для кагосці салодкасці, сама-ж ела—гора, а гора ела мяне. Васмігадовай дзяўчынкай мяне аддалі на работу. Мары—вучыцца, былі амаль недасягаемымі. Ды і марыць у тыя часы не кожнай з нас удавалася. Працавалі па 12—15 гадзін у суткі.

Бывала перад святамі гаспадар загуляе, п'яны сунецца ў майстэрню, накрычыць на рабочых, а потым пачнеш падлічваць: у нас 12, а ў яго—10.—З п'яных вачэй двух гадзін не далічыў, так пачынае свой расказ Бэрта Абрамаўна.

— Вучылі мяне працаваць па способу грубога ўздзейнічання—руганню, пінкамі і т. д. Праз пяць год такой навукі я, нарэшце, зрабілася майстрам. Але жыццё ад гэтага ніколькі не рабілася лепшым.

Непрагляднае, шэрае, агіднае жыццё здавалася бясконцым.

III.

Бываюць у жанчын біяграфіі падобныя на анекдот: „А і Б сядзелі на трубе"... Толькі паспее пачацца напоўсвядомае жыццё дзяўчынкі, узваляць на яе груду непасільных работ, а там глядзі на сваю жаночую долю: кухня, бялізна і т. д. Потым рыхтуйся замуж. Не паспееш глянуць, як маладыя гады згарэлі, загінулі... Так было ў старой Расіі. А зараз і ў Германіі фашысты невыпадкова ізноў адкапалі сярэдневяковую запаведзь—тройцу: кірхэн, кіндэр, кюхен (цэркаў, дзіця, кухня). Яны гавораць, што для жанчын больш нічога не прызначана.

Калі-б не Окцябрская рэволюцыя, тое-ж самае чакала-б і Бэрту Абрамаўну. Тады ёй было 17 год.

Окцябрская рэволюцыя адчыніла вочы тав. Ганчарык.

„Кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржавай"—сказаў Ленін. І мне адразу зрабілася ясна куды ісці. Як толькі быў выдадзен закон пра ўсеагульнае абавязковае навучанне ў 1919 годзе, я сама ахвотна пашла ў лікбез,—працягвае Бэрта Абрамаўна.

— Помню выпадак перад самай рэволюцыяй, у пачатку 1917 года гаспадар Сопер ударыў адну з нашых работніц—Машу Сімановіч. Я заступілася за яе. Але тады мы не маглі нічым яму адпомсціць. Пасля рэволюцыі ён за гэты ўдар атрымаў па заслугам.

Надыходзіў перыяд нэпа. І вось тав. Ганчарык працуе ў працкалектыве. Наведвае пры табачнай фабрыцы палітгурток. Робіцца дэлегаткай жэнаддзела, а ў 1923 годзе яна ўступае ў комсамол.

Так яе біяграфія напаўняецца яркімі падзеямі жыцця вольнага чалавека.

Не стала Леніна...

Мільёны працоўных яшчэ мацней згуртаваліся навокал партыі. Абвешчан Ленінскі прызыў.

Дзесяткі, сотні, тысячы рабочых становяцца ў рады перадавога авангарда пролетарыята.

Тав. Ганчарык таксама ўступае ў партыю праз ячэйку харчавікоў. Тут яна актывізуецца яшчэ больш. Працягваючы працаваць у працкалектыве яна абіраецца ў цэхком і вылучаецца жэнарганізатарам групкома харчавікоў, не пакідаючы працы на вытворчасці.

Шматлікі працкалектыў „Прагрэс" робіцца фабрыкай „Комунарка". Устанаўляюцца машыны. Бэрту Абрамаўну пасылаюць у Маскву для пераквалiфікацыі на самую буйную фабрыку ў СССР імя Бабаева.

Некалькі разоў яна прыходзіла ў маўзалей паглядзець на Леніна, пры светлым розуме якога яна ўбачыла свой шлях і новае вялікае жыццё.

У 1928 годзе Ганчарык працуе брыгадзірам. У 1930 годзе абіраецца сакратаром цэхавай парт'ячэйкі, а потым партарганізатарам. Працуючы зменным майстрам карамельнага цэха, яна з'яўляецца сапраўднай ударніцай, добрым арганізатарам соцыялістычнага спаборніцтва. За перавыкананне плана яе змена прэміравана 900 руб. Некалькі разоў фабрыка прэміравала яе асабіста. Разам з гэтым працуючы ў фінансавай секцыі Менскага горсовета, за бліскучую арганізацыю сярод мас падпіскі на заём, яна была прэміравана кабінетнай швейнай машынай.

Так Бэрта Абрамаўна заняла слаўнае месца сярод герояў першай пяцігодкі.

Камісія па чыстцы партыі на фабрыцы „Комунарка" у сваіх вывадах адзначыла першай — лепшай па рабоце, партгрупу карамельнага цэха, дзе працавала парторгам тав. Ганчарык.

З кастрычніка месяца 1934 года яна паслана была на вучобу ў рэспубліканскую школу профруху пры ЦСПСБ.

— Цяжкавата вучыцца, тэорыі мала, — кажа Бэрта Абрамаўна. Акрамя лікбеза я ў другіх школах не вучылася. Маёй школай да гэтага было жыццё, партыя, фабрыка, профсаюз.

Але па курсу палітэканоміі яна мае адзнаку—„добра".

— На фабрыцы не здавалася, не здамся і тут,—заяўляе т. Ганчарык.

Такім быў шлях комуністкі Ленінскага прызыва, якая прайшла жыццё ад загортвання цукеркі ў паперу да пранікнення ў сутнасць палітэканоміі. Гэтую дачку рабочага класа сапраўды выхавала партыя Леніна.

Вось чаму так ярка гараць агні нашага жыцця.

Іг. Л-Іч.

ПЕРШЫ СТРОГАЛЬ

З двумя дзяўчынамі трапіла я ў строгальны цэх завода „Большэвік". Строгаль—самая высокая кваліфікацыя. Строгалем, як існуе скураная прамысловасць, былі толькі мужчыны і з'яўленне жанчын у цэху выклікала розныя здагадкі і жарты:

— Баба—строгаль?—перасіліў чыйсці голас машыну, ха-ха-ха!

— Каб-жа хоць баба, а то са спадніцы не відаць,—прылучыўся другі строгаль.

— Чаго гэта яны нам баб падсоўваюць.

Так сустрэлі мяне ўпершыню ў цэху. Але ішоў час. Атмасфера непрыязні паступова знікла. Ты лепш вазьміся ды паднясі мне тавар для работы, прыглядайся, як машыну змазваць, як машыну трэба падрыхтаваць да работы. Як надзяваць шчыт, як трэба перастаўляць камень—гаварыў Перачынскі.

— І мяне не абмінай. Падыйдзі да станка, пакажу, раскажу—казаў уздагон тав. Бандарчык.

— Я падскочыла, не чуючы пад сабой ног ад радасці. Усё неяк адарвалася і патанула ў гуле машын. Толькі час ад часу перабівалася ў вушах раскацістым смехам, але тут-жа свежым месівам хромавай стружкі ляцела пад барабан. Да канца змены я не адыходзіла ад станкоў Бандарчыка і Перачынскага.

Работа вырашыла адносіны. Змазаная машына, паднесены тавар у Міхаіла Фёдаравіча, перастаўлены камень і прыгатаваная машына да работы ў тав. Клюпса, вычэрквалі заключэнне мінулага, а нараджалі новае.

Машына гатова, тавар пад рукой, яно так глядзі і не дрэнна,—гаварыў Міхаіл Фёдаравіч да тав. Клюпса.

Не супярэчу на большую выработку, але ўсе гэтыя лады не надоўга, бо строгаля з яе ніколі не было і не будзе. Адна ўжо ўцякла і другой не відаць. Дай ты ім у рукі фальц і прыстаў ты іх да балмы, то і аднаго дня не пратрымаюцца. Ручаюся. Дый станок спадніцы не падначаліцца. Ты запомні гэты дзень, што яна яшчэ прыглядаецца да станка—уцячэ.

4.

Дні праходзілі. Упартай тэхнічнай вучобай станок вывучан. Працэс строгання, навык, спрыт і ўменне падачы скуры трэба набываць у часе работы.

— Абедзве падругі перайшлі на другую работу, засталася я адна. Мяне прымацавалі да станкоў самых лепшых строгаляў, тав. Варшаўскага і Хаета.

— На табе скуру і няхай яна ў цябе навучыцца строгальнаму майстэрству,—гаворыць тав. Варшаўскі,—калі яна ў цябе загаворыць строгальным языком, бяры наступную, вунь у той кучцы,—ён паказаў на месца, дзе ляжалі лемітныя, спецыяльна прызначаныя для вучняў, скуры.

— Усе пасля работы ішлі дамоў, а я заставалася ў цэху і пачынала зразумелую гутурку са станком. Страшны станок, які кіраваўся толькі мужчынамі—загаварыў. Рванула ў мяне з рук скуру і штурхнула пад станок на стружкі. Добра, што ніхто не бачыў. Чырванню заліло мне твар, я вырвалася з мінутнага страху і кінулася да педалі. Сіла патрэбна, а думала толькі спрыт... Трымаю моцна рукамі скуру і пускаю другі раз на вал—прайшла. Стружка адляцела. Прыглядваюся—не дрэнна, але трэба так рабіць, як таварышы Варшаўскі, Хает, Перачынскі, Бандарчык. Скура гатовая, за выключэннем маленькага трэпа (парэза скуры, лесвіцамі). Я пускаю скуру, каб згладзіць, але няроўны рывок педалі і скура, на зламанне карку, ляціць у машыну. Абкручвае валік: парэзы, дзіркі і станок стаў. Ну, думаю, не авалодаць мне табою, але развага выйшла наперад няўдачы. Гэта-ж самы лепшы майстар рэзаў на першых парах, а мне, ды яшчэ дзяўчыне—даруецца.

— Чые гэта скуры?—пытаецца бракёр тав. Таболін, прышоўшы на работу.

— Я нічога не адказала на запытанне і не прызналася, што гэта мае. Ён некалькі адабраў да чацвертасортных, а ўсе астатнія палажыў да трэцясортных.

— Прайшло тыдні са два, я свае выработаныя скуры часткамі падкладала маім майстрам таварышам Варшаўскаму і Хаету. Бракёр прымаў, як другасортны. Я нібы тая зязюлька ў чужыя гнёзды падкладвала, цяпер са смехам успамінаю мінулае. Праходзіць вялікі прамежак часу і вось аднойчы тав. Варшаўскі кажа мне:

— Пакажы ты, Надзя, нам сваю работу?

Я доўга недумаючы—уступеце станок!

А ў самой сэрца застукала. А чаго і чаму з'явіўся такі страх было незразумелым.

— А што, калі на вачах будзе не ўдавацца.

Заіскрыўся нож, ад прабегшага па вастрыях нажэй камня і педаль так-жа рытмічна націскалася нагою, рука прывычнымі рыўкамі клала на валік скуру. Адна за аднэй клаліся ўстос скуры і кожная праходзіла праз рукі таварышоў Варшаўскага і Хаета.

Семімінутны перапынак быў незвыклым для цэха. Усе строгалі, галоўны майстар тав. Капялевіч, бракёр, тав. Таболін, пастаўшы навокал маёй работы, гаварылі аб якасці. Першымі падыйшлі Міхаіл Фёдаравіч і тав. Клюпс.

— Панакладваў тавару сваёй работы і кліча кваліфікаваць яго, як майстра—гаворыць упэўненым голасам тав. Клюпс.

— Ты, таварыш Варшаўскі, каго разыгрываць сабраўся? Хочаш, каб жанчына ішла ў нагу са строгалем...

Тав. Варшаўскі, не даўшы многа разважаць строгалям, аклікнуў Надзю, якая ў гэты час гутарыла з сакратаром комсамольскай ячэйкі ў рамачным цэху.

— Ускочыла я ў цэх, гляджу ўсе строгалі, галоўны майстар, бракёр стаяць, нібы хто іх выставіў на прагляд.

— Станавіся, тав. Лагунова, да станка,—гавора тав. Варшаўскі.

— Я падышла да станка без усялякіх разваг і страху. Скура за скурай паскаралі свой выхад са станка і праходзілі з рук у рукі строгалеў, майстроў і бракёраў. Міхаіл Фёдаравіч параўнаў

з работамі лепшых строгалеў і не адрозніў дзе горшыя, дзе лепшыя. На гэты раз Міхаіл Фёдаравіч і тав. Клюпс засталіся пераконанымі.

5.

— Мы чарапашымі тэмпамі пляцемся. Наш цэх адстаў на 18 проц. у выкананні,—гаворыць прафорг у часе цэхавага сходу, мы хранічна з дэкады ў дэкаду не выконваем прамфінплана. Мы павінны падвоіць выпуск добраякаснай прадукцыі, каб запазычанасць цэха ў выкананні прамфінплана перад рабочымі і калгаснікамі ліквідаваць перавыкананнем.

— Мы ад гэтага часу вырабляці па 200—215 скур, я ўношу прапанову вырабляць 250—кажа Надзя.

Зашушукаліся строгалі і са здзіўленнем пераглянуліся. А тав. Клюпс, паціснуўшы плячыма, захіхікаў, насунуўшы шапку, але гэта ужо не быў той раскацісты смех, а затоеная няўпэўненасць у магчымасці даць такую лічбу.

— Не паспела аперыцца, а ўжо сабралася ў вялікі пералёт.

— Так. І вас, тав. Клюпс, выклікаю зрабіць такі-ж пералёт.

Мой сустрэчны быў успрыняты больш знадворна, чымся ўпэўнена ў маёй магчымасці. Я разлічыла, скараціла кожны непатрэбны рух. Усё, што перашкаджала мне ў рабоце, я ўбрала. Першы дзень я замест 215—выпрабіла 278. Лічба для строгалеў новая і здаваўшаяся немагчымай была здалёк відаць на дошцы выканання. Усе сачылі за якасцю работы і колькасным падлікам.

— Я з кожным днём ішла ўсё з большым перакананнем, што можна выпрабляць значна больш і лепш, як да гэтага часу. Кожны дзень упісваў новыя лічбы, а ў апошні дзень дэкады красавалася лічба—278 (гэтая лічба стала нормай выработкі строгаля). Тав. Клюпс падышоў да мяне і шчыра прызнаўся:

— Мае гады і твае!

— Вашы погляды і мае поспехі!—І тут-жа задала тав. Клюпсу пытанне: — а рэкордная лічба строгаля якая?

— 500 скур! Але ты зразумей, чалавек згарыць ад такой нагрузкі, мускулы не вытрымаюць, галава закіслее.

Тав. Клюпс працуе са мной у адным цэху і ўпэўнен, што мускулы мае з кожным годам мацнеюць. Лічба 470 — выканана. XVII гадавіне Окцябра я рапартавала рэкорднай лічбай—500.

6.

— Цяпер я з'яўляюся намеснікам старшыні фабкома, і давяду, што грамадскую работу магу таксама выконваць, як ля станка я перавыконвала прамфінплан.

— Яна ўжо некалькі разоў прэміравана,—гаворыць сакратар парткома тав. Перачынскі,—8-га сакавіка атрымала значок „ЗОТ“ і Варашылаўскага стралка. Многіх рэбят пераквалiфікавала. Наша гордасць жанчына—першы строгаль!

Я кінуў свой зрок на скрутачак газет з надпісам—Лагунова. Без усялякага на гэта дазволу, узяў скрутачак. Мне хацелася яе бачыць па-за вытворчасцю і чым яна занята. Разварачваю гляджу: „Комсамольская праўда“, „Чырвоная змена“ і журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“, а па сярэдзіне—Салтыкоў-Шчэдрын.

— Яна „Іудушку Галаўлёва“ у другі раз прачытвае,—гаворыць бібліятэкарша, і не толькі Салтыкова-Шчэдрына, яна прачытала Максіма Горькага, Анры Барбюса, Чэхава, Талстога, Шекспіра, Бела Ілеш, Панферава, Новікава—Прыбоя, Шолахава, Леонава, Купалу, Коласа, Аляксандровіча—уся асабовая картка яе спісана класікамі і пролетарскімі пісьменнікамі.

Мышко.

Тодар Алесін

ЛЕНІНСКІ ДЭКРЭТ

Прысвячаецца Алесі Л., якая ліквідавала сваю няпісьменнасць.

У думках маіх паўстаў Ленін,
Дэкрэт... Дзевятнаццаты год.
Вялікі мысліцель і геній
Павёў да навукі народ.
Я помню суровыя буры
Заметалі снегам шляхі,
Узросталі белыя гуры,
Марозы агнямі пяклі.
Алеся, якой люты вецер
Ружовіў асмуглены твар,
У школу ішла кожны вечар
З сабой нясучы лемантар.
У школе за шэрай скамейкай
Трымцелі ад кніжак лісткі
І з гонарам зайздрасці нейкай
Ўпіваліся вочы ў радкі.

Праходзілі зімы і леты,
Як нашае працы напеў...
Рэдактарам сценнай газеты
Сягоння абралі яе.
І хочацца здольнасць і веды
Жыццю і тварэнню аддаць,
Каб працай, здабытай пабедай
— Расцвет комунізма вітаць.
І там, дзе з прадвеку гасціла
Праклятая скрозь цемната,
Паўстала магутнаю сілай
Навука Ільіча.
Таму вось ізноў у думках Ленін,
Дэкрэт... Дзевятнаццаты год.
Вялікі мысліцель і геній
Павёў да навукі народ.

Рабочыя цяпер прызваны не толькі стаяць ля варштата, але і кіраваць сродкамі вытворчасці—фабрыкамі і заводамі. І зусім натуральна цяпер імкненне да навукі, якое абудзілася сярод рабочых. Рабочыя імкнуцца да навукі і школы, і наша задача цяпер даць ім гэтую навуку і школу.

(ЛЕНІН).

Хімічны корпўс Магілеўскай шоўкавай фабрыкі. Сушка цэлулозы.

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ

Магілеўская фабрыка штучнага шоўку імя тав. Куйбышава—гігант першай пяцігодкі. Яна пабудавана і пушчана ў ход у лістападзе 1930 года. Фабрыка мае ўсесаюзнае значэнне.

Стройныя карпусы высока ўздымаюцца на двары.

Пабудавана свая цепло-электрацэнтраль, якая забяспечвае прадпрыемства электраэнергіяй.

З чаго робіцца штучны шоўк? Гэта першае пытанне, якое цікавіць кожнага наведвальніка фабрыкі. Але калі пазнаёмішся з усімі цэхамі, ужо не дзівіць факт, што штучнае шоўкавае валакно вырабляецца з цэлулозы (тоўстая папера, якая робіцца з дрэва).

Вытворчасць вельмі складаная і патрабуе абавязковых ведаў тэхналагічнага працэса. Дзякуючы большэвіцкай рабоце кіраўніцтва фабрыкі, шырока разгорнутай тэхнічнай вучобе і вывучэння з'явішч выклікаючых брак, фабрыка дабілася такіх велізарных поспехаў, што яна займае першае месца па трэсту штучнага валакна СССР.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі рабочы калектыў Магілеўскай шоўкавай фабрыкі з'явіўся першым ініцыятарам па БССР па арганізацыі вытворчага пахода імя VII з'езда советаў. Па ўсім брыгадам, па ўсім карпусам разгарнулася масавая работа з дапамогай нізавога друку.

Кожны рабочы і работніца ўсвядомілі сабе важнасць выканання сваіх абавязацельстваў. У выніку гэтага фабрыка выканала прамфінплан у цэннасным выразе яшчэ 27 лістапада, а рабочы калектыў абавязаўся даць дзяржаве звыш плана дадаткова да канца года прадукцыі на 5 мільёнаў рублёў. Свае абавязацельствы рабочыя і работніцы перавыканалі. Гадавы план па ўсім паказальнікам выкананан на 7 снежня—у цэннасным выразе на 106 проц. і па якасці на—103,8 проц., замест 46,8 проц. 1-га сорта па плану, выпушчана за 11 месяцаў—50,6 проц. А за апошні месяц першы сорт дасягае 90 проц.

Рвані замест 4 проц. па плану, маецца фактычна 2,8 проц.

Замест дадатковай прадукцыі на 5 мільёнаў рублёў па абавязацельствам, выпушчана на 6 мільёнаў 200 тысяч рублёў.

* * *

Няўхільна з кожным годам расце выпуск прадукцыі фабрыкі; прадукцыйнасць працы павышаецца, паляпшаецца матэрыяльна-бытавое становішча рабочых і работніц.

Першага сортавалакна ў 1931 г. выпушчана—8,1 проц., у 1932 годзе—16,5 проц., у 1933 годзе—40,9 проц., за 11 месяцаў 1934 года—50,6 проц., прадукцыйнасць працы на аднаго рабочага ў дзень узнялася больш чым на 50 проц. За час існавання фабрыкі выраслі 4 новых дамы для рабочых і ІТР з усімі выгадамі. Пабудаваны прыгожыя яслі на 200 дзяцей, якія працуюць круглыя суткі. Яслі пашылі польты для ўсіх дзяцей, набылі кожнаму валёнкі і галошы.

* * *

Спачатку пабудовы фабрыкі рабочымі яшчэ слаба былі асвоены новыя складаныя машыны, складаныя тэхналагічныя працэсы. Яшчэ не былі падрыхтаваны свае тэхнічныя кадры. Працавалі нямецкія спецыялісты-інжынеры, якія імкнуліся працягнуць буржуазную думку, што ў прадзільным цэху нельга ўкараніць жаночую працу, што жанчыны могуць працаваць толькі ў тэкстыльным корпусе, дзе працэс вытворчасці не вельмі складаны. Але партыйная, прафсаюзная арганізацыя і дырэкцыя фабрыкі павялі барацьбу з гэтай буржуазнай устаноўкай і рашуча паставілі пытанне аб укараненні жаночай працы ў прадзільным корпусе. Цяпер там 40 проц. работніц, якія працуюць не горш за рабочых, а нават часамі і лепш. Старшая работніца жаночага агрэгата т. **Аблакова** сама добра аўладала тэхнікай, асвоіла свой тэхналагічны працэс, працуе без брака і ўвесь агрэгат ідзе ўперадзе ўсіх. Работніца гэтага агрэгата Андрэйчыкава—зотаўка працуе без браку і паломкі дэталяў.

Фабрыка за гэты час вырасціла і выхавала не адну сотню работніц—знатных людзей, лепшых ударніц вытворчасці, грамадскай работы.

Работніца—вылучэнка тав. Каган Люба. Прышла на фабрыку малапісьменнай. Раней працавала судамойкай у сталоўцы 10 год. На фабрыцы яна вырасла культурна, скончыла вышэйшую тэхнічную школу фабрыкі і атрымала кваліфікацыю тэхніка. Цяпер яна працуе майстрам сушыльнага цэха, з'яўляецца партыйным арганізатарам тэкстыльнага корпуса. У гэтым годзе рабочы калектыў абраў Любу Каган дэпутатам Магілеўскага горсовета, а на раённым з'ездзе советаў яе абралі членам раённага выканаўчага камітэта.

Тав. **Клімовіч**—брыгадзір 1-й брыгады мотальнага цэха.

Тав. Знаскова—брыгадзір брыгады сушыльнага цэха—зотаўка, старая работніца. Раней была зусім непісьменная. На фабрыцы ліквідавала непісьменнасць, уступіла ў партыю і ўвесь час працуе над сабой, чытае рэгулярна газеты і на вытворчасці з'яўляецца перадавой.

Работніца **Клімовіч** вылучана брыгадзірам брыгады матальнага цэха. Яе брыгада паказвае ўзоры работы. Выконвае і перавыконвае прамфінплан без брака. Брыгада

Е КІРАЎНІЦТВА
НЫ ЛА ПЕРАМОГУ

лімовіч моцна трымае пераходны ырвоны сцяг трохкутніка фаб-ыкі.

Не адстае і работніца тав. **Пят-ова**—памочнік брыгадзіра адбель-ых машын. Яна ліквідавала ня-аўна непісьменнасць, упарта рацуе над павышэннем сваёй раматнасці. Тав. Пятрова зай-аецца ў кандыдацкай школе і ступіла нядаўна ў рады спачу-аючых.

Партыйная і агульна-асветная учоба разгорнута добра. Кожны орпус мае свой лікпункт, у якім аняткі праводзяцца па брыгадах зменах. Ёсць агульна-адукацый-ая вячэрняя школа, у якой зай-аецца вялікая колькасць работ-ц.

У быт работніц вельмі ўкаранія-ася вучоба. Яна стала неаддзель-ай часткай у рабоце на фабрыцы. учоба выхавала новых людзей.

Работніца матальнага цэха, якая ступіла ў спачуваючыя т. Ланько, к заявіла на сходзе: „Для мяне учоба ў палітшколе вышэй за ё. Хадзіць на заняткі для мяне— нар, раней у царкву з такой хвотай не бегла, як цяпер у колу. Хаця ў мяне ёсць двое ясцей—я ўсё-ж паспяваю і ні ных заняткаў не прапусціла.

Тэхнічнай вучобе надаецца асаб-вая ўвага. На фабрыцы налічаецца на першае студзеня 1935 г. 96 выдатнікаў, з іх жанчын—69. сяго здалі тэхнічны экзамен 041 чалавек.

Цяпер арганізаваны гурткі па-шанага тыпа для ўдасканалення хнічных ведаў зотаўцаў. Рабо-ія і работніцы абавязаліся ў па-дку выканання рашэнняў злёта таўцаў, да 1-га мая 1935 года



Тав. **Знаскова**—брыгадзір першай брыгады сушыльнага цэха, зотаўка.

ператварыць фабрыку ў прадпрыемства суцэльнай тэхнічнай пісьменнасці.

Е. Эпштэйн.

Магілёў.

Тав. **Пятрова**—памочнік брыгадзіра адбельных машын, уступіла ў рады спачуваючых.

ПРАЦУЕМ УДАРНА І ДРУЖНА

Фільерачны цэх—падсобны ў прадзільным корпусе Магілеўскай шоўкавай фабрыкі. Мы падрыхтоўваем фільеры на суткі работы для прадзільных машын. Праз гэтыя фільеры праходзіць віскоза, з якой выпрабляюцца шоўкавыя ніткі. Зразумела, што ад чыстаты фільеры і правільнай запраўкі іх залежыць якасць валакна. Гэта ўсё ўскладае на нас асаблівую адказнасць па добраякаснаму выкананню сваёй работы.

Раней мы працавалі ў 4 змены. Патрабавалася вялікая колькасць работніц, не было дастатковага нагляда спецыялістаў і рабочы дзень не быў ушчыльнен. Цяпер увялі рацыяналізацыю работы—арганізавалі адну дзенную брыгаду, якая падрыхтоўвае фільеры для работы ўсіх змен.

Гэта дало вялікі эфект. Мы поўнасцю ўшчыльнілі рабочы дзень, працуем увесь час пад наглядам вопытнага майстра і гэта значна палепшыла якасць нашай прадукцыі. Замест планавых 4 проц. браку мы фактычна маем 1,5 проц. Поўнасцю выконваем сваю норму. Ніколі па віне фільершчыц не бывае прастоя і затрымкі прадзільных машын.

Усе 13 работніц нашай брыгады—ударніцы. 5 чалавек былі прэміраваны ў час чатырохгадовага юбілея фабрыкі ў лістападзе 1934 года. У брыгадзе зараз 8 зотавак, астатнія рыхтуюцца да тэхнічнага экзамена. Усе работніцы ахоплены рознымі відамі вучобы.

Брыгада: **Федзяніна, Шлейчонак, Прыгарына, Парэбка, Гаеўская, Крыўчык, Крысевіч, Нісенбаум, Бусоўская, Эпштэйн.**

КОЛДАГАВОРНАЯ НА ШЧОТАЧНАЙ

У праверцы выканання калектыўнага дагавора на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай прымалі ўдзел усе рабочыя фабрыкі. Гэта гаворыць за тое, што падрыхтоўчая работа была праведзена не дрэнна.

Пытанне праверкі колдагавора распрацоўвалася на нарадзе профактыва, злёце ўдарнікаў і зотаўцаў, на сходах рабкораў фабрыкі і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала. Былі створаны 33 добраахвотных самаправерачных брыгады з ліку лепшых ударнікаў фабрыкі.

Да праверкі колдагавора фабрыка прышла са значнымі дасягненнямі, асабліва ў галіне культурна-бытавых умоў: адрамантавана 13 рабочых кватэр на суму 7.000 руб., выдана рабочым 350 лістоў фанеры, 3 скрынкі цвікоў, 5 скрынак шкла, абояў, цэглы і другога неабходнага матэрыялу для рамонта кватэр рабочых-ударнікаў. Акрамя гэтага пабудаваны яслі з чатырох вялікіх пакояў, якія праведзены на кругласутачную работу, і адрамантован дзіцячы сад.

На фабрыцы праведзен рамонт цэхоў, зроблена пабелка, ашкленне і т. д. Але побач з вялікімі дасягненнямі выяўлены ў працэсе праверкі дагавора і значныя прабелы, асабліва ў галіне зарплаты—зніжэнне расцэнак на асобныя працэсы работы. Па ахове працы—невыдаткавана 1500 руб. Вельмі дрэнна абстаіць справа з санітарным становішчам на фабрыцы. Ва ўсіх цэхах пануе бруд, адсутнічае гатаваная вада, не выдаецца мыла і ручнікі для мыцця рук рабочым, несвоечасова мяняецца спецвопратка і т. д.

Усе гэтыя недахопы ўскрыты на сходах рабочых шляхам разгорнутай самакрытыкі. Для знішчэння пералічаных недахопаў унесена 97 прапаноў.

Праверкай дагавора партыйныя, прафесіянальныя арганізацыі, адміністрацыя і рабочыя яшчэ больш сябе мабілізавалі на выкананне ўсіх пунктаў дагавора, ад якога залежыць паспяховае выкананне прамфінплана.

Л. П.

SZCZĘŚCIE FILOMENY

